Падтрымай "Вясну" на PATREON

Новы тыдзень пачынаецца прадказальна - з судоў, арыштаў, штрафаў

дапоўнена

16.10.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, акцыі



Судовая зала.

У панядзелак суды разглядаюць адміністратыўныя справы "Моладзі БНФ", якія ўдзельнічалі ў раздачы стужачак з нацыянальным арнаментам у Мінску 25 верасня, а таксама ўдзельнікаў акцыі 1 верасня ў Слуцку, якая была прымеркаваная да Дня ведаў.

У судзе Партызанскага раёна Мінска сёння адбудзецца новы разгляд адміністратыўнай справы лідара руху «Разам» **Вячаслава Сіўчыка** за ўдзел у акцыі пратэсту супраць вайсковых вучэнняў «Захад-2017", якая адбылася 8 верасня. Пачатак судовага паседжання ў 9-30. У гэтым судзе 28 верасня палітык быў пакараны за Дзень вайсковай славы штрафам у памеры 45 б.в. (1 035,00 руб). Але раённая пракуратура вынесла пратэст і хадайнічала аб пераглядзе справы. Мінскі гарадскі суд 11 кастрычніка пастанавіў накіраваць справу на новы разгляд у суд Партызанскага раёна.

Згодна з пастановай суда Вячаслаў Сіўчык пакараны арыштам тэрмінам 5 сутак. Палітык на судзе не прысутнічаў.

У судзе Маскоўскага раёна 16 кастрычніка чакаюцца адміністратыўныя працэсы над актывістамі "Моладзі БНФ". У 9-30 пачнецца суд над **Дзянісам Мандзікам**, у 11-00 – над **Кацярынай Шуст**. Іх вінавацяць у парушэнні парадку арганізацыі масавага мерапрыемства (арт. 23.34 КаАП). Акцыя адбылася 25 жніўня, у дзень, калі Вярхоўны Савет БССР прыняў закон аб наданні Беларусі суверэнітэту. З гэтай нагоды Моладзь БНФ усклала кветкі да магілаў дэпутатаў Вярхоўнага савету 12-га склікання, а затым павіншавала беларусаў з днём 25 жніўня раздачай стужак з нацыянальным арнаментам.

Дзянісу Мандзіку прысудзілі штраф у памеры 25 базавых велічынь, **Кацярыне Шуст** таксама штраф -- 20 базавых велічынь.

У Слуцку пачынаюцца суды над удзельнікамі акцыі «Дзень ведаў - урок гісторыі», якая прайшла з удзелам вядомага мастака Алеся Пушкіна 1 верасня. Сёння ў 12-00 будуць судзіць мясцовую актывістку **Аліну Нагорную**.

У судзе над Алінай Нагорнай у Слуцку – узмоцненыя меры бяспекі, паколькі ахоўніца суда запрасіла падмацаванне для аховы правапарадку, бо "ўсе узбуджанныя". Аліну прыйшлі падтрымаць больш за 10 человек. Справу разглядае суддзя Аляксандр Тарасюк. Хадайніцтва аб вядзенні працэсу на беларускай мове, задаволенае, відэаздымка забаронена.

На працэсе выступілі сведкі – супрацоўнікі міліцыі і прадстаўнікі Нагорнай – журналісты **Зінаіда Цімошак і Сяржук Кійко**. Суддзя, нават не робячы перапынку для падрыхтоўкі рашэння, зачытаў пастанову – штраф 20 базавых велічынь.


17 кастрычніка – працяг судоў над актывістамі “Моладзі БНФ”, якія раздавалі стужачкі з нацыянальным арнаментам у Мінску 25 жніўня. Суд Маскоўскага раёна пачне разгляд справы **Багдана Сакалова**. Пачатак у 10-00.


У гэтым жа судзе ў 11 гадзін будзе разглядацца адміністратыўная справа палітолага **Алеся Лагвінца** за акцыю да Дня ведаў у Слуцку.

У сераду, 18 кастрычніка, суд Маскоўскага раёна будзе разглядаць адміністратыўную справу актывіста “Моладзі БНФ” **Ягора Сергіенкі,** таксама за акцыю 25 жніўня.

Твитнуть







СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ


Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

